# Партрэт святара ў стылі рок

**У Маладзёжным тэатры эстрады рыхтуецца прэм’ера незвычайнага мюзікла духоўнай тэматыкі. У аснове аўтабіяграфічнага твора, які вырашаны ў стылістыцы сімфароку, — жыццяпіс протаіерэя Мікалая Гур’янава.**

— Мюзікл так і называецца — “Гур’янаў”, — гаворыць мастацкі кіраўнік тэатра, аўтар лібрэта і рэжысёр спектакля Уладзіслава Арцюкоўская. — У гонар аднаго з самых ушанаваных старцаў праваслаўнай царквы. Зварот да гэтай тэмы звязаны з маёй даўняй асабістай гісторыяй. Маці хварэла на анкалогію, і ў шпіталі хтосьці з ранейшых пацыентаў пакінуў брашуру пра айца Мікалая — так я ўпершыню даведалася пра Гур’янава, які быў нашым сучаснікам: ён памёр у 2002-м. У кніжцы былі не скупыя біяграфічныя звесткі, а суцэльныя аповеды пра яго, пра людзей, якіх ён вылечыў, вярнуў да веры. Мы разам з мамай гэта чыталі, спасцігалі таямніцу яго любові да людзей. Мне ўжо тады падумалася, што патрэбныя мюзіклы не толькі гістарычныя, паводле вядомых літаратурных крыніц альбо цалкам на прыдуманыя сюжэты, але і пра нашых вялікіх сучаснікаў — такіх, як Мікалай Гур’янаў. Нарэшце гэтая мара споўніцца. Вядома, мы напісалі лісты ў Епархію, атрымалі блаславленне. Праваслаўная царква таксама зацікаўленая, каб распаўсюджвалася слова Божае, яны і фільмы здымаюць на духоўныя тэмы. Дарэчы, у стужцы Паўла Лунгіна “Востраў” прататыпам героя быў Мікалай Гур’янаў. Мы ж звяртаемся да дакументальных гісторый, якія распавядалі відавочцы. Адна з іх — як паралізаваны чалавек, спяшаючыся за айцом Мікалаем, вываліўся з інваліднага вазка і папоўз. А старац яму: “Чаго паўзеш? Уставай і ідзі!” — і той пайшоў! Праз увесь спектакль — тэмы любові і веры. Невыпадковы і зварот да складаных харавых партый, да сімфароку: музыку, як і ў большасці мюзіклаў на нашай сцэне, напісаў Аляксандр Сухараў. Рок — таму што да Гур’янава прыязджалі многія рок-музыканты, ён іх блаславіў. А сімфанічны складнік дае магчымасць шырока развіваць музычнае палатно, што неабходна для такой тэматыкі. Прэм’ера невыпадкова прызначаная праз месяц — акурат на 24 мая: гэта дзень народзінаў Мікалая Гур’янава.



Макет сцэнаграфіі мюзікла (мастак — Вольга Грыцаева)

Падабраўся выдатны склад артыстаў. Айца Мікалая сыграе ўсім добра вядомы Руслан Чарнецкі. Але ён не галоўны герой мюзікла. Дзеянне адбываецца ў 1985 годзе. У цэнтры — навуковец-фізік, якога ўвасобіць глыбокі, цікавы артыст і спявак Арцём Пінчук. Гэта гісторыя пра тое, як пасля знаёмства з Гур’янавым з ім адбываецца метамарфоза: з меркантыльнага, няверуючага чалавека ён прыходзіць да разумення любові і веры. Голас Анёла аддадзены опернаму вакалу: на гэтую ролю мы запрасілі салістку Вялікага тэатра Беларусі, лаўрэата міжнародных конкурсаў Марту Данусевіч: яе крышталёвае сапрана як мага лепей створыць гэты вобраз, нават крылы не трэба прымацоўваць. Дарэчы, Марце і яе мужу, тэнару Тарасу Прысяжнюку, мы далі паслухаць музыку будучага мюзікла яшчэ ў працэсе работы над ёй, і яны горача падтрымалі праект. Падтрымала стварэнне спектакля і Міністэрства культуры: нашаму тэатру вылучылі грант на пастаноўку. Усе працуюць на ўздыме сіл і эмоцый, натхняе сама тэма і светлая асоба Гур’янава, якая аказвае добры ўплыў на людзей і пасля яго смерці.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ
БГУКИ